**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______________ А. І. Жук
22.04.2013

Рэгістрацыйны № ТД-D. 282 /тып.

# ГІСТОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ КРАІНЫ ВЫВУЧАЕМАЙ МОВЫ
## (Гісторыя сербскай літаратуры)

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для ўстаноў вышэйшай адукацыі**
**па спецыяльнасці**
**1-21 05 04 «Славянская філалогія»**

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
______________ [illegible]оня
12.04.20[illegible]

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
______________ С.І. Раманюк
22.04.2013

Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»
______________ В.І.Шупляк
04.04.2013

Эксперт-нормакантралёр
______________ Н.А. Бараноўцова
04.04.2013

Мінск 2013

Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (гіст. сербскай літаратуры)


**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Чарота І. А.** – загадчык кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Сербскай Акадэміі навук і мастацтваў



**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

кафедра сусветнай літаратуры і культуралогіі установы адукацыі “Полацкі дзяржаўны універсітэт”;

**Лаўшук С.С.** – галоўны навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы “Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі”, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН РБ.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

кафедрай славянскіх літаратур філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, пратакол № 5 ад 10 лютага 2012 г.;

навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага універсітэта, пратакол № 4 ад 30 сакавіка 2012 г.;

навукова-метадычным саветам па філалагічных спецыяльнасцях Вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь па гуманітарнай адукацыі, пратакол № 4 ад 14 сакавіка 2012 г.

# I. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (Гісторыя сербскай літаратуры)» прадугледжана адукацыйным стандартам і тыпавым вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 1-21 05 04 "Славянская філалогія".

Праграма ахоплівае найбольш істотныя з'явы сербскай славеснасці ад вытокаў па сённяшні час, зняшчаючы характарыстыкі адпаведных эпох развіцця мастацтва слова сербаў, нацыянальнага літаратурнага працэсу ў цэлым, паказальных з'яў і асноўных прадстаўнікоў кожнага перыяду.

Літаратура прадстаўляецца як сістэма адметнага светаадлюстравання, а г.зн. як важнейшы сродак ідэнтыфікацыі сербскага народа, яго духоўнасці.

Адпаведна, Праграма арыентуе перш за ўсё не на вывучэнне творчасці асобных пісьменнікаў як "рэчаў у сабе". Праблемна-тэматычныя агляды асноўную ўвагу засяроджваюць на ўнутраных заканамернасцях уласна сербскага мастацтва слова і на яго суадносінах з шырэйшымі кантэкстамі: югаславянскім (г.зн. народаў былой Югаславіі), паўднёваславянскім, агульнаславянскім, еўрапейскім, сусветным. Асобна вылучаюцца паўднёваславянска-усходнеславянскія ўзаемадзеянні даўнейшых часоў, а таксама сербска-беларускія і сербска-рускія кантакты XX –XXI стагоддзяў. Пры разглядзе персаналій галоўнае – не агульныя звесткі пра пісьменнікаў і іх творы, а духоўна-культурна-гістарычная запатрабаванасць тых ці іншых пісьменнікаў з адпаведнымі творамі. Так што студэнтам прапаноўваецца ўважліва асэнсоўваць умовы, дзякуючы якім з'яўляюцца запатрабаваныя аўтары і творы. Вывучэнне творчасці канкрэтнага мастака слова мае мэтай высветліць яго светапогляд і тып мастацкага мыслення, які абумоўлівае пэўныя рысы стылю, а таксама асаблівасці індывідуальнай паэтыкі. Агульны аналіз твораў сербскай літаратуры праводзіцца з улікам плёну іншых гуманітарных навук – гісторыі, культуралогіі, фалькларыстыкі, этналогіі, філасофіі, псіхалогіі, эстэтыкі. Праграма арыентуецца на веды, якія студэнты атрымліваюць па розных дысцыплінах (у першую чаргу – сумежных) і адначасова дае матэрыял для больш глыбокага засваення гэтых дысцыплін. Так, само па сабе зразумела, што гісторыя сербскага пісьменства не можа разглядацца без апоры на вусную народную творчасць і перш за ўсё – гераічны эпас сербаў, які даўно мае сусветнае прызнанне. З другога боку, неадменна трымаецца пад увагай, што нацыянальная літаратура XVII – XXI стагоддзяў у шматлікіх формах засвойвала і трансфармавала народную паэтычную спадчыну – прычым, як неадменна дзейсную.

Не абмінаецца ўвагай славянская літаратурная супольнасць. Належным чынам улічваецца тыпалогія развіцця роднасных літаратур, а ў прыватнасці – сыходжанні паміж творчымі пошукамі ў сербскай і беларускай літаратурах.

Праграма па гісторыі сербскай літаратуры, натуральна, выкарыстоўвае асноўныя палажэнні агульнапрынятай тэорыі літаратуры. Але пры гэтым

фіксуюцца і адрозненні, якія існуюць у нацыянальных літаратуразнаўчых школах.

Прапанаваная Праграма павінна служыць дапаможнікам пры засваенні базавых раздзелаў курса, роўна як і тэм, прадугледжаных для самастойнага вывучэння. Яна можа выкарыстоўвацца таксама пры распрацоўцы спецкурсаў для студэнтаў-філолагаў розных спецыяльнасцей, факультатываў па сербскай літаратуры і сербска-іншанацыянальных літаратурных сувязях, па вывучэнні тэорыі і практыкі мастацкага перакладу.

Прапанаванае асвятленне гісторыі сербскай літаратуры можа таксама зацікавіць магістрантаў, аспірантаў і выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін устаноў вышэйшай адукацыі, шырокае кола даследчыкаў наогул.

**Мэта** прапанаванага курса – даць сістэматызаваныя веды пра асноўныя этапы і з'явы літаратурнага працэсу ў Сербіі ад часоў стварэння першых помнікаў пісьменства да сучаснасці ў кантэксце агульнага развіцця культуры, гісторыі, грамадскага жыцця сербскага народа. Параўнальна-гістарычны (сінхранічны і дыяхранічны) падыход да разгляду і ацэнкі асобных фактаў і з'яў уласна сербскага літаратурнага працэсу дапаўняецца тыпалагічнымі аспектамі.

У Праграме прапаноўваецца матэрыял не толькі вядомы і вывучаны, але і не даследаваны яшчэ. Адпаведна, студэнтам падказваюцца перспектыўныя шляхі самастойнай творчай і даследчыцкай працы, што дапамагае ім раскрыць многія здольнасці, рэалізаваць індывідуальныя магчымасці і аптымізаваць прафесійную падрыхтоўку.

Інфармацыйны змест Праграмы прадугледжвае модульнасць навучання, што робіць яе максімальна зручнай у выкарыстанні.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (Гісторыя сербскай літаратуры)» **студэнты павінны ведаць:**

асноўныя асаблівасці гісторыі, перыяды развіцця сербскай літаратуры;

ідэйна-мастацкія характарыстыкі кожнага перыяду развіцця;

нацыянальную спецыфіку сербскай літаратуры;

галоўныя напрамкі і літаратурныя плыні ў гісторыі сербскай літаратуры;

творчую спадчыну эпох і вызначальных пісьменнікаў кожнай эпохі.

**Студэнты павінны ўмець**:

прадставіць сербскую літаратуру як сістэму;

даць уяўленне аб тыпалагічных і ўнікальных асаблівасцях сербскай літаратуры;

вызначаць прыкметы кожнага перыяду развіцця сербскай літаратуры;

ахарактарызаваць літаратурныя напрамкі, плыні, школы, распазнаваць адметнасці мастацкіх напрамкаў і стыляў;

аналізаваць і характарызаваць творчасць усіх вызначальных прадстаўнікоў сербскай літаратуры;

параўноўваць літаратурныя з'явы і мастацкія творы з улікам іх ідэйнай, эстэтычнай вартасці, разнастайнасці тэматыкі, жанравых форм, вобразна-выяўленчых сродкаў і стылёвых асаблівасцей;

акрэсліць заканамернасці сувязяў сербскай і беларускай літаратур, а таксама ўспрымання сербскай літаратуры ў Беларусі.

Формы навучання: лекцыі з выкладам асноўных гісторыка-літаратурных і тэарэтычных ведаў; практычны аналіз мастацкіх тэкстаў на занятках; азнаямленне з асновамі навукова-даследчай працы ў працэсе падрыхтоўкі рэфератаў, курсавых і дыпломных сачыненняў.

Праграма накіроўвае студэнтаў на самастойную працу пры даследаванні асобных этапаў развіцця літаратуры краіны вывучаемай мовы (сербскай), выяўленні спецыфікі мастацкіх твораў ці перыядаў у развіцці культурнага кірунку, стылю і г. д. Рэкамендуемая самастойная праца студэнтаў прадугледжвае выкананне тэстаў, азнаямленне з вучэбнай, вучэбна-метадычнай і навуковай літаратурай, напісанне эсэ, рэфератаў па канкрэтных тэмах і раздзелах, стварэнне прэзентацый. Грунтоўны спіс асноўнай і дадатковай літаратуры дае магчымасць студэнтам самастойна вывучаць пэўныя тэмы, розныя інтэрпрэтацыі твораў у літаратурнай крытыцы, схіляе да сталай метадалагічнай рэфлексіі і творчага падыходу ў разглядзе таго ці іншага пытання.

У адпаведнасці з аб'ёмам і задачамі кожнага канкрэтнага курса як выкладчыкі, так і студэнты маюць магчымасць выбару з шэрагу навуковых літаратуразнаўчых крыніц тых прац, якія з'яўляюцца характэрнымі, паказальнымі, важкімі для асэнсавання таго ці іншага літаратурнага факта або працэсу. Улічваючы пашырэнне сучасных сродкаў камунікацыі, прапануюцца таксама спасылкі на рэсурсы глабальнай сеткі Інтэрнет.

Праграма створана з улікам апошніх дасягненняў у сербскім і айчынным літаратуразнаўстве, распрацовак па методыцы выкладання літаратуры.

Агульная колькасць гадзін, якая даецца на вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (Гісторыя сербскай літаратуры)» згодна з тыпавым вучэбным планам, складае 703 гадзіны. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцый – 212 гадзін, практычных заняткаў – 118 гадзін. Агульная колькасць аўдыторных гадзін – 330.

## II. Прыкладны тэматычны план

| № п/п | Тэмы заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | лекцый | практычных заняткаў |
| **1.** | **Прапедэўтыка** (Уводзіны ў гісторыю сербскай літаратуры) | **34** | **22** | **12** |
| 1.1 | Гісторыя сербскай літаратуры як галіна літаратуразнаўства | | 2 | |
| 1.2 | Вусная творчасць паўднёвых славян старажытнага перыяду | | 2 | 2 |
| 1.3 | Фальклор сербаў у параўнальна-тыпалагічным асвятленні | | 2 | |
| 1.4 | Зараджэнне ўласна сербскай літаратуры (XI – XIII ст.) | | 2 | 2 |
| 1.5 | Сербская агіяграфія ад старажытнасці да сучаснасці | | 2 | |
| 1.6 | Летапісная спадчына сербаў | | 2 | 2 |
| 1.7 | Літаратура Сербіі XIV-XVIII стст. Сербска- (бела)рускія кантакты | | 4 | |
| 1.8 | Барока і Асветніцтва ў Сербіі Усходнеславянскія ўплывы | | 2 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1.9 | Літаратурны працэс XIX ст.: Перадрамантызм, рамантызм і станаўленне рэалізму | | 2 | 2 |
| 1.10 | Асноўныя тэндэнцыі развіцця сербскай літаратуры XX ст. | | 2 | 2 |
| **2.** | ***Народная літаратура*** | **30** | **20** | **10** |
| 2.1 | Сербская “народна књижевност”: узнікненне, асаблівасці развіцця. Прынцыпы класіфікацыі. Асноўныя віды і жанры | | 4 | 2 |
| 2.2 | Адметнасць абрадавых песень: “додолске”, “краљичке”, “славске”, “лазаричке”. Лірычная паэзія | | 2 | 2 |
| 2.3 | Важнейшыя фальклорныя запісы, збіральнікі і даследчыкі | | 2 | 2 |
| 2.4 | Паэтычны эпас. Значнейшыя цыклы | | 4 | 2 |
| 2.5 | Мастацкія асаблівасці сербскага эпасу | | 2 | |
| 2.6 | Ліра-эпічныя творы. Народныя балады, рамансы. Рэлігійна-маралістычныя песні | | 4 | |
| 2.7 | Празаічныя жанры. Прыказкі і прымаўкі. Загадкі | | 2 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **3** | **Пачаткі сербскага прыгожага пісьменства** | **26** | **18** | **8** |
| 3.1 | Місія свв. Кірыла і Мяфодзія, іх вучняў на землях паўднёвых славян | | 4 | |
| 3.2 | Старажытныя помнікі глагалічныя і кірылічныя | | 2 | 2 |
| 3.3 | Жыццяпісы, агіяграфічныя творы | | 4 | |
| 3.4 | Пахвальныя словы, пропаведзі, духоўныя вершы | | 2 | 2 |
| 3.5 | Летапісная спадчына. Юрыдычныя пісьмовыя помнікі | | 2 | 2 |
| 3.6 | Сербская перакладная літаратура сярэднявечча. Апокрыфы | | 2 | 2 |
| 3.7 | Маралістычныя і дыдактычныя творы | | 2 | |
| **4** | **Сербская літаратура XVII - XVIII стагоддзяў** | **30** | **20** | **10** |
| 4.1 | Пісьменства ў рэчышчы традыцый | | 2 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4.2 | Рачанская школа сербскай кніжнасці | | 4 | |
| 4.3 | Гісторыка-літаратурная спадчына Джорджа Бранкавіча | | 2 | 2 |
| 4.4 | Усходнеславянскія ўплывы | | 4 | |
| 4.5 | Творчасць Эмануіла (Міхаіла) Казачынскага | | 2 | |
| 4.6 | Творчая спадчына Гаўрыіла Венцлавіча | | 2 | 2 |
| 4.7 | Ёван Раіч і Захарыя Арфелін як прадаўжальнікі нацыянальна-духоўнай традыцыі і носьбіты новых ідэй | | 2 | 2 |
| 4.8 | Эвалюцыя сістэмы жанраў і паэтыкі. Асаблівасці сербскага барока | | 2 | 2 |
| **5** | **Асноўныя заканамернасці літаратурнага працэсу ў Сербіі першай паловы XIX стагоддзя** | **52** | **34** | **18** |
| 5.1 | Літаратура эпохі асветніцтва. Рацыяналізм | | 4 | 2 |
| 5.2 | Першыя перыядычныя выданні. Кнігадрук | | 2 | |
| 5.3 | Дасітэй Абрадавіч – асветнік і пісьменнік | | 4 | 2 |
| 5.4 | Д.Абрадавіч і С.Пішчавіч на беларускіх землях | | 2 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5.5 | Праявы класіцызму ў Сербіі | | 4 | |
| 5.6 | Сербскі сентыменталізм і передрамантызм | | 2 | 2 |
| 5.7 | Творчая спадчына Ёвана Стэрыі Попавіча | | 4 | 2 |
| 5.8 | Ё. Субаціч, С. Мілуцінавіч, В.Жыўкавіч | | 2 | 2 |
| 5.9 | Фальклорная спадчына і эпас барацьбы за вызваленне | | 2 | 2 |
| 5.10 | Роля Вука Караджыча ў сербскім культурным адраджэнні. | | 4 | 2 |
| 5.11 | Творчасць Петара II Петравіча Негаша як сінтэз памкненняў нацыянальнай літаратуры | | 4 | 2 |
| **6** | **Сербская літаратура другой паловы XIX ст.** | **52** | **36** | **16** |
| 6.1 | Грамадска-палітычныя передумовы станаўлення рамантызму | | 2 | |
| 6.2 | Ідэйна-мастацкія пошукі Бранкі Радзічавіча | | 4 | 2 |
| 6.3 | Рамантызм як дамінантная плынь сербскай паэзіі 1850-1860-х гадоў | | 4 | 2 |
| 6.4 | Ёван Ёванавіч Змай і яго творчыя здзяйсненні | | 6 | 2 |
| 6.5 | Джура Якшыч – паэт, празаік, драматург | | 4 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6.6 | Лаза Косціч у нацыянальным і еўрапейскім кантэкстах | | 2 | 2 |
| 6.7 | Ранні этап сербскага рэалізму | | 4 | |
| 6.8 | Ідэі рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў; С. Маркавіч, Пера Тадоравіч | | 2 | 2 |
| 6.9 | Этнаграфізм, псіхалагізм і сацыяльная крытыка ў сербскай прозе | | 4 | 2 |
| 6.10 | Сербскі гістарычны раман другой паловы XIX стагоддзя | | 2 | 2 |
| 6.11 | Роды, віды, жанры сербскага прыгожага пісьменства к. XIX ст. | | 2 | |
| **7.** | **Сербская літаратура XX ст.** | **58** | **32** | **26** |
| 7.1. | Панарама: "српска модерна", "југословенска модерна" | | 4 | 2 |
| 7.2. | Нацыянальна-традыцыйнае і еўрапейскае ў сербскім мастацтве | | 2 | 2 |
| 7.3. | Літаратурная перыёдыка. Эстэтыка, літаратуразнаўства і крытыка | | 4 | 2 |
| 7.4 | Вартасці паэзіі Алексы Шанціча, Ёвана Дучыча і Мілана Ракіча | | 4 | 4 |
| 7.5 | Паэты-наватары. Уласна сербскія мадэрнісцкія кірункі | | 4 | 2 |
| 7.6 | Панарама сербскай прозы ў асобах І. Чыпіка, П. Кочыча, В.Петравіча, М. Ускокавіча, Б. Станкавіча | | 6 | 6 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 7.7 | Месца Браніслава Нушыча ў сербскай літаратуры | | 2 | 2 |
| 7.8 | Творчасць прадстаўнікоў “левіцы”, “сацыяльнай літаратуры”, “новага рэалізму” | | 4 | 4 |
| 7.9 | Тэарэтычнае і літаратурна-крытычнае асэнсаванне літаратурнага працэсу эпохі | | 2 | 2 |
| **8** | **Сербская літаратура другой паловы XX – пачатку XXI стст.** | **48** | **30** | **18** |
| 8.1 | Народна-вызваленчая барацьба і мастацтва слова | | 4 | 2 |
| 8.2 | Асэнсаванне гераізму і трагізму народа ў прозе 1950-70-х гадоў | | 4 | 2 |
| 8.3 | Універсалізм мастацкага светапогляду Івы Андрыча | | 2 | 2 |
| 8.4 | Мілаш Црнянскі і сербская гістарычная проза | | 2 | 2 |
| 8.5 | Повязь часоў у эпічных творах Добрыцы Чосіча | | 2 | 2 |
| 8.6 | Новыя жанры і формы сербскай прозы | | 4 | 2 |
| 8.7 | Адметнасць творчых лёсаў і асоб (сербскія паэты к.XX – п.XXI стст. ) | | 4 | 2 |
| 8.8 | Сучасная сербская драматургія | | 4 | 2 |
| 8.9 | Літаратура для дзяцей і моладзі | | 2 | 2 |
| 8.10 | Сучасная літаратуразнаўчая навука і крытыка. Асэнсаванне сувязей. | | 2 | |
| | **Усяго гадзін** | **330** | **212** | **118** |

# III. ЗМЕСТ

## 1. ПРАПЕДЭЎТЫКА (УВОДЗІНЫ Ў ГІСТОРЫЮ СЕРБСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ)

Сербістыка як навуковая галіна ў развіцці і як вучэбная дысцыпліна: прадмет, фактычны матэрыял, метадалогія.

Супярэчлівасць інтэрпрэтацый этнагенезу, эвалюцыі нацыянальнага самавызначэння і дзяржаўна-палітычнага сцвярджэння народаў былой СФРЮ ў посткамуністычную эпоху.

Сутнасць адпаведных працэсаў з пункту гледжання тыпалогіі.

Сербскае, югаслаўскае і агульнаславянскае ў плане суадноснасці ідэй і вядомых рухаў па рэалізацыі гэтых ідэй: дзейнасць свв. Кірыла і Мяфодзія і іх вучняў на паўднёваславянскіх землях; інтэграцыйныя і дэзінтэграцыйныя працэсы ў гісторыі паўднёвых славян на працягу XIV - XVIII стагоддзяў; перадумовы зараджэння ілірызму і словінства; аўстраславізм сярод іншых палітычных і культурна-гістарычных рухаў свайго часу; ідэя агульнасці славян у кантэксце сусветнай палітыкі XX стагоддзя; комплекс прычын, якія абумоўлівалі здзяйсненне трох канцэпцый дзяржавы Югаславіі ( Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў/ Каралеўства Югаславія — Федэратыўная Народная Рэспубліка Югаславія/ Сацыялістычная Федэратыўная Рэспубліка Югаславія — Саюзная Рэспубліка Югаславія).

Ідэнтыфікацыя сербскасці ў комплексе этнагенетычных, моўных, канфесійных, культурна-гістарычных, геапалітычных прыкмет. Аб'ектыўна абумоўленыя сувязі і рэальныя ўплывы.

Роля Праваслаўя і духоўнай спадчыны Візантыі ў сцвярджэнні сербства як нацыянальна-культурнага супольства.

Асяродкі духоўнай культуры сербаў, якія маюць сусветнае значэнне: манастыры Хіландар (на Афоне), Студзеніча, Грачаніца, Дэчаны, Печская патрыярхія, Мілешава, Сопачаны.

Канкрэтна-гістарычны змест паняцця сербская культура (культура Сербіі, Чарнагорыі, Босніі і Герцагавіны, Косава і Метохіі, Ваяводзіны, Краіны) у параўнанні з такімі паняццямі, як югаслаўская культура — г.зн. культура Каралеўства Югаславіі, Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі, Саюзнай Рэспублікі Югаславіі, адпаведна, перыядаў існававання кожнай з названых краін, югаславянская культура — г.зн. культура народаў, якія складалі супольнасць, незалежна ад змен у працэсах дзяржаўна-палітычнага характару, паўднёваславянская культура — г.зн. культура ўсіх паўднёвых славян.

Асаблівасці самаідэнтыфікацыі чарнагорцаў у мінулым і цяпер.

Сербскі нацыянальны пачатак суадносна з чарнагорскім, македонскім, харвацкім, славенскім, мусульманскім, албанскім.

Лёсавызначальныя падзеі ў гісторыі сербскага народа.

Нэманя (Стэфан — св. Сімяон Міраточывы) і Нэманічы (Растка — св. Сава, Стэфан Першавенчаны, Вукан), князь Лазар, Карагеоргій, князь Мілаш Абрэнавіч, Петар II Петравіч Негаш, Марка Мілянаў, кароль Аляксандр Карагеоргіевіч, Нікала Пашыч як гістарычныя асобы.

Слынныя дзеячы асветы, навукі, мастацтва: св. Сава, Архіепіскап Даніла, Канстанцін Філосаф, Патрыярх Паісій, Дасітэй Абрадавіч, Вук Караджыч, Джура Данічыч, Ёван Скерліч, Аляксандр Беліч, Ёван Цвііч, Стэван Стаянавіч Мокраняц, Дзімітрый Аўрамавіч, Ураш Прэдзіч, Надэжда Петравіч, Міліч ад Мачвы.

Вехі сцвярджэння ўласна сербскай літаратуры: накірункі развіцця, важнейшыя плыні, прынцыпы перыядызацыі. Найбольш вядомыя пісьменнікі — Канстанцін Філосаф, Ёван Стэрыя Попавіч, Бранка Радзічавіч, Ёван Ёванавіч Змай, Джура Якшыч, Ёван Дучыч, Мілан Ракіч, Браніслаў Нушыч, Іва Андрыч, Мілаш Црнянскі, Бранка Чопіч, Дэсанка Максімавіч, Добрыца Чосіч, Васка Попа.

Асветныя і навукова-культурныя інстытуцыі: "Велика школа" (Бялград,1808) — Бялградскі універсітэт (1905), Маціца сербская (1826), Народная бібліятэка Сербіі (1832), Таварыства сербскай славеснасці (1842) — Сербскае вучонае таварыства (1864) — Сербская акадэмія навук і мастацтваў (1886), Сербскі народны тэатр (Нові Сад, 1861).

Развіццё выдавецкай справы. Перыядычны друк.

Тэатр, музыка, выяўленчае мастацтва Сербіі .

Уклад сербаў у культуру, асвету, навуку іншых краін і народаў (Пахомій Лагафет, Сімяон Зорыч, Міхайла Пупін, Нікала Тэсла, Радуле Стыенскі, Марка С. Маркавіч).

Удзел прадстаўнікоў сербскай нацыі ў міжнародных палітычных рухах XIX-XX стст.: Светазар Маркавіч, Жываін Жуёвіч, Дзімітрый Туцавіч, Вукашын Маркавіч, Мірка Маркавіч, Мілаван Джылас.

Сербія і Еўропа: рэтраспектыўны і актуалізаваны погляды.

Гісторыя ўзаемадачыненняў Сербіі з Расіяй.

Беларуска-сербскія сувязі ў важнейшых фактах і асобах.

## *2. Народная літаратура*

Вусная творчасць паўднёвых славян старажытнага перыяду.

Фальклор сербаў у параўнальна-тыпалагічным асвятленні.

Сербская "*народна књижевност*": узнікненне, характар, прынцыпы класіфікацыі. Важнейшыя запісы, вядомыя збіральнікі і даследчыкі.

Асноўныя віды і жанры.

*Лірычная паэзія*

Песні "мужчынскія" і "жаночыя"; міфалагічныя, пабожныя, (каляндарна)абрадавыя, сямейныя і побытавыя, працоўныя, любоўныя,

жартоўныя, патрыятычныя. Спецыфіка такіх жанраў, як песні “додолске”,“краљичке”, “славске”, “лазаричке”.

*Паэтычны эпас*

Паводле прынятай класіфікацыі, падзел на “десетерачке” і “бугарштице”. Цыклы: негістарычны, дакосаўскі, косаўскі, паслякосаўскі, каралевіча Марка, гайдуцкі, ускочкі, вызвалення Сербіі, вызвалення Чарнагорыі.

Мастацкія асаблівасці сербскага эпасу: характэрнейшыя прыкметы светаадлюстравання, галерэя тыпаў, спецыфічнае ў сістэме паэтыкі.

Выканаўцы-творцы эпічных песень: Філіп Вішніч, Тэшан Падругавіч, старац Мілія, старац Рашка, Слепа Жывана.

*Ліра-эпічныя творы*

Народныя балады, рамансы. Рэлігійна-маралістычныя песні.

*Празаічныя жанры*

Казкі, легенды і паданні, народныя навэлы, анекдоты, байкі.

Прыказкі і прымаўкі. Пытальніцы (“питалице”). Загадкі.

* * *

Уплыў фальклору на развіццё літаратуры і выяўленчага мастацтва.

Вусная народная творчасць часоў першай і другой сусветных войнаў.

### *3. Пачаткі сербскага прыгожага пісьменства*

Місія свв. Кірыла і Мяфодзія, іх вучняў на землях паўднёвых славян (сучасная Македонія). Охрыдская, Кратаўская і Брэгалніцкая школы пісьменства.

Першыя азбукі. Царкоўнаславянская мова як літаратурная. Сербская рэдакцыя царкоўнаславянскай мовы і жывыя гаворкі ў старажытных помніках пісьменства.

*Старажытнейшыя помнікі глагалічныя:*

Марыінскае Евангелле (XI ст), Гершкавічаў і Міханавічаў урыўкі з “Апостальскіх дзеянняў” (XI -XII стст.).

*Старажытнейшыя помнікі кірылічныя:*

Тэмнічкі надпіс (X-XI ст.), пліты (“плоче”) — Хумская (X-XI ст., суддзі Градзішы, з-пад Трэбіня (другая палова XII ст), ліст баснійскага бана Куліна да дуброўчанаў (1189), Міраслаўлева Евангелле (XII ст.).

*Жыццяпісы і ўласна агіяграфічныя творы*

Жыціе св. Сімяона (аўтарства св. Савы і Стэфана Першавенчанага), св. Савы (аўтарства Даменціяна, Тэадосія), Жыціі каралёў і архіепіскапаў сербскіх (Даніілаў зборнік), Жыціе Стэфана Дэчанскага (аўтарства Грыгорыя Цамблака), Жыціе дэспата Стэфана Лазаравіча (аўтар — Канстанцін Філосаф), Жыціе цара Ураша (аўтар — патрыярх Паісій).

“Панонскія легенды”. Жыціі свв. Кірыла, Мяфодзія, Пятра Корышкага, Джорджа Кратаўца.

*Пахвальныя словы (“похвале”) і пропаведзі (“беседе”)*

Яфіміна “Пахвала князю Лазару”, “Повесныя словы” пра князя Лазара (Грыгорыя Цамблака (?) і патрыярха Данііла).

“Пахвала св. Кірылу (Канстанціну)” Клімента Охрыдскага, “Надмагільнае слова дэспату Джурджу Бранкавічу” невядомага аўтара.

*Вершы*

“Азбучная малітва” і “ Проглас св. Евангелля” Канстанціна Прасвітара,

Сілуанавы вершы пра св. Саву, “Слова любові” дэспата Стэфана Лазаравіча.

*Гістарычна-летапісная спадчына*

Летапіс папа Дукляніна (др. пал. XII ст.). Летапісы Копрынскі і Печскі. Вукаманавічаў хранограф.

Радасловы (Врхабрэзніцкі, Карлавацкі, Траношскі).

Запісы (Тэадора спана, Исаіі манаха, Райчына Судзіча, манахіні Яфіміі). Запіс пра Косава.

Пасланне святога Савы ігумену Спірыдону.

*Юрыдычныя помнікі*

Грамата Куліна, Хіландарская грамата Стэфана Першавенчанага. Студзенічкі ціпік(он). Душанаў законнік.

*Сербская перакладная літаратура сярэднявечча*

*Раманы і аповесці*

“Варлаам і Іаасаф”, “Прамудры Акір”, “Цар Аса”, “Царыца Тэафана”, “Эладзіе”, “Дванаццаць сноў цара Шакіша”.

“Раман пра Аляксандра Вялікага”, “Раман пра Трою”.

“Трыстан і Ізольда”, “Бава ад Антоны”, “Ланселот”.

*Апокрыфы*

“Адкравенне Варухава”, “ Кніга пра Адама і Еву”, “Хаджэнне Багародзіцы па пакутах”.

*Маралістычныя і дыдактычныя творы*

“Фізіёлаг”, “Луцідар”, “Квецень ад годнасці”.

*Кантэкст: Літаратура Дуброўніка і Далмацыі*

Агульнае і своеасаблівае ў развіцці прыгожага пісьменства роднасных і суседніх народаў.

Гуманізм і рэнесанс (Марка Маруліч, Маўра Ветэранавіч).

Дуброўніцкія петраркісты (Шышка Менчэціч, Джора Држыч, Андрыя Чурбанавіч і Мікша Пелегрынавіч, Дзінка Раніна, Дамініка Златарыч).

Рэнесансная літаратура на Хвары і ў Задары (Ханібал Луціч, Петар Хектаравіч, Марцін Бенетавіч, Петар Зораніч, Брна Крнаруціч).

Марын Држыч, Іван Гундуліч як значнейшыя прадстаўнікі Дуброўніцка-далмацінскай літаратуры. Гісторыясофскі змест паэмы І.Гундуліча ”Асман”

## *4. Сербская літаратура XVII - XVIII стагоддзяў*

Абумоўленасць развіцця духоўнай культуры і мастацтва сербаў знешне- і ўнутрыпалітычнымі фактарамі.

Вусная паэтычная творчасць гэтага перыяду.

Пісьменства ў рэчышчы традыцый:

Рачанская школа — “Сціхіра князю Лазару” Кіпрыяна, “Падарожжа да града Ерусаліма” Ератэя, творчая спадчына Гаўрыіла Венцлавіча.

“Славенасербская хроніка” Джорджа Бранкавіча.

Імпульсы з перыферыйных рэгіёнаў і суседніх земляў: Босніі — М.Дзіўкавіч, С.Мацiевiч, П.Папіч; Славоніі — М.А.Рэлкавіч, В.Дошэн; Чарнагорыі — А.Змаевіч, І. А. Ненадзіч; Далмацыі — А. Міошыч Качыч, Харватыі — Б.Кашыч, П. Вітэзавіч. Барочныя тэндэнцыі.

Усходнеславянскі ўплыў на развіццё літаратуры праз сістэму асветы і кадыфікацыю літаратурнай мовы (сербскаславянская і рускаславянская рэдакцыі).

“Траэкамедыя пра цара Ураша” Эмануіла (Міхаіла) Казачынскага.

Еван Раіч і Захарыя Арфелін як прадаўжальнікі нацыянальна-духоўнай традыцыі і носьбіты новых ідэй.

Эвалюцыя сістэмы жанраў і паэтыкі. Асаблівасці сербскага барока.

## *5. Асноўныя заканамернасці літаратурнага працэсу ў Сербіі першай паловы XIX стагоддзя*

Замежныя, іншаканфесійныя і ўласныя крыніцы асветніцкіх ідэй у Сербіі XVIII стагоддзя. Рэцэпцыя філасофскіх і мастацкіх ідэй Буало, Дзідро, Вальтэра, Русо, Гердэра, Гётэ. Сутнасць “ёзэфінізму”.

Роля перакладной літаратуры (перш за ўсё з класічных, раманскіх і германскіх моў).

Навукова-асветніцкія справы і творы Стэфана Вуяноўскага, Атанасія Дземетравіча Секерэша, Тэадора Янкавіча Мірыеўскага, Эмануіла Янкавіча, Евана Мушкаціравіча, Аўрама Мразавіча, Савы Тэкеліі.

Першыя перыядычныя выданні: “Славенасербскі магазін” Захарыі Арфеліна, “Славена-сербскія ведамасці” Стэфана Навакавіча.

Значэнне асобы Дасітэя Абрадавіча; яго “Жыццё і прыгоды”, “Парады здаровага розуму”, “Байкі”.

Кантакты з рускай літаратурай і культурай.

Дзейнасць Д.Абрадавіча і С.Пішчавіча на беларускіх землях.

Арыентацыі на *класіцызм*.

Асаблівасці праяў *сентыменталізму* і *перадрамантызму* ў сербскай літаратуры.

Алексіе Везіліч, Атанасіе Стойкавіч, Глігорые Трлаіч; Лукіян Мушыцкі, Паўле Берыч, Еван Хаджыч, Васіліе Субаціч; Ніканор Груіч, Светазар Вуіч; Стэфан Стэфанавіч, Лазар Лазаравіч як прадстаўнікі асноўных літаратурна-мастацкіх плыняў.

Ідэйна-мастацкая разнастайнасць творчай спадчыны Евана Стэрыі Попавіча: гістарычныя драмы і трагедыі — “Смерць Стэфана Дэчанскага”, “Уладзіслаў”, “Лахан”, “Свеціслаў і Мілева”, “Мілаш Обіліч”, камедыі — “Скнара”, “Родалюбы”, “Бялград некалі і цяпер”, “Хлус і прыхлуснік”, раман

“Бітва на Косаве альбо Мілан Топліца і Зараіда”, сатырычны “Раман без рамана”.

* * *

Цікавасць да сербскахарвацкай (“влашке”, “морлачке”) народнай паэзіі ў Еўропе: роля А.Форціса, Ё.Гердэра, І.В.Гётэ, Ш.Надзье, П.Мэрымэ, А.Пушкіна.

Сербскі нацыянальна-вызваленчы рух і ўздым культуры.

Развіццё перыядычнага друку: “Новине сербске”, “Сербски летопис”, “Забавник”, “Даница”, “Сербски народни лист”, “Српско-далматински магазин” і інш.

Першыя навуковыя і культурныя суполкі ( Маціца сербская, Таварыства сербскай славеснасці).

Актуалізацыя фальклорнай спадчыны і эпас барацьбы за вызваленне пачатку XIX ст. “Бунт супраць дахіяў” Філіпа Вішніча.

Роля Вука Караджыча — як лексікографа, лінгвіста-тэарэтыка, перакладчыка Святога Пісання, фалькларыста, этнолага, гісторыка — у сербскім культурным адраджэнні.

Сербскія філолагі Паўле Соларыч, Джура Данічыч, Стоян Навакавіч.

Між класіцызмам і рамантызмам: паэзія Сімы Мілуцінавіча, Васы Жыўкавіча, Ёвана Субаціча.

Мемуары і падарожныя нататкі Д. Абрадавіча, С. Пішчавіча, прот. М.Ненадавіча, Ё. Вуіча, М. Відакавіча, Л.Ненадавіча.

Творчасць Петара Петравіча Негаша як сінтэз памкненняў нацыянальнай літаратуры: “Горны вянок”, “Прамень мікракосму”.

### *6. Сербская літаратура другой паловы XIX ст.*

Сукупнасць чыннікаў, якія прадвызначалі развіццё сербскай літаратуры сярэдзіны XIX стагоддзя.

Грамадска-палітычныя перадумовы станаўлення рамантызму.

Уплывы замежных паэтаў-рамантыкаў (Дж.Байрана, Г.Гейнэ, Ш.Пецёфі).

Роля такіх культурных асяродкаў, як Трст (Трыест), Вена, Будапешт. Нові Сад — “сербскія Афіны”.

Асаблівасці ідэйна-мастацкіх пошукаў Бранкі Радзічавіча.

Рамантызм як дамінантны стыль сербскай паэзіі 1850-1860-х гадоў.

Ёван Ёванавіч Змай і яго творчыя здзяйсненні: зборнікі паэзіі “Ружы”, “Ружы завялыя”, “Спеўнік I”, “Спеўнік II”, “Сненні”; сатыра, пераклады твораў Гётэ, Гейнэ, Пецёфі, Лермантава, Пушкіна; запачаткаванне сербскай дзіцячай літаратуры.

Джура Якшыч — паэт, празаік, драматург, жывапісец рамантычнага складу.

Літаратурная і філасофска-эстэтычная спадчына Лазы Косціча ў нацыянальным і агульнаеўрапейскім кантэкстах.

Проза і драматургія ў рэчышчы рамантызму (творчасць Мiларада Попавiча Шапчанiна).

***

Агульная панарама культурных працэсаў у Сербii пасля набыцця незалежнасцi.

Кантакты з рускай культурай як вызначальныя дзеля сцвярджэння рэалістычнай эстэтыкі. Пераклады з рускай мовы. Непасрэдныя ўплывы М.Гогаля, І.Тургенева, Л.Талстога, Ф.Дастаеўскага.

Ранні этап сербскага рэалізму: навелістыка Стэфана Мітрава Любішы ("Прыпавесці чарнагорскія і прыморскія", "Апаведы Вука Дойчавіча"); раманы Якава Ігнятавіча "Дзіўны свет", "Вечны жаніх", "Васа Рэшпект" .

Сацыяльна-палітычныя і эстэтычныя ідэі, абуджаныя рускімі рэвалюцыйнымі дэмакратамі і трансфармаваныя Светазарам Маркавічам, Перам Тадоравічам. Крытычны рэалізм.

Асноўны пафас апавяданняў ("Галава цукру", "Рагатае", "Злавесная лічба", "Рэдкі звер") і камедый ("Падвох", "Дзве дваццаткі") Мілавана Глішыча.

Этнаграфізм і сацыяльная крытыка ў прозе Мілана Мілічавіча, Лазы Лазаравіча, Янкі Весялінавіча, Светаліка Ранкавіча, Сімы Матавуля.

Палітычная сатыра ў аповесцях і апавяданнях Радое Даманавіча — "Страдзія", "Данга", "Правадыр", "Мёртвае мора".

Гумарыстычная проза Стэвана Срэмца.

Сербскі гістарычны раман другой паловы XIX стагоддзя ("Гайдук Станка" Янкі Весялінавіча, "Хаджы Джэра" Драгуціна Іліча, "Перабежчык" Сімы Матавуля).

Паэзія эпохі рэалізму. Наватарства творчасці Воіслава Іліча.

Рэалістычная драматургія Мілавана Глішыча, Янкі Весялінавіча, Мілуціна Іліча.

Феномен Бранiслава Нушыча-драматурга ("Даніна крывёю", "Хаджы Лоя", "Так мусіла быць", "Грэх за грэх","Народны пасланнік", "Падазроная асоба" і пазнейшае — "Пані міністрыха", "Сям'я ў жалобе", "Доктар", "Нябожчык" ).

## *7. Сербская літаратура XX ст.*

Змест паняццяў "српска модерна", "југословенска модерна".

<u>Кантэкст:</u> новыя памкненні ў харвацкай (Антун Густаў Маташ, Іва Войнавіч, Антун Бранка Шыміч, Уладзімір Відрыч, Дзінка Шымунавіч, Мілан Бегавіч, Уладзімір Назар, Мiраслаў Крлежа) і славенскай (Ёсіп Мурн Аляксандраў, Драгацін Кетэ, Іван Цанкар, Отан Жупанчыч) літаратурах.

Супярэчлівасць цывілізацыйных, палітычных, сацыяльна-эканамічных, філасофска-ідэалагічных і эстэтычных працэсаў у свеце канца XIX - пачатку XX стагоддзя.

Дачыненні сербскай літаратуры да ўплывовых кірункаў развіцця еўрапейскага мастацтва (рэалізму, натуралізму, сімвалізму, "парнасу", імпрэсіянізму, футурызму, экспрэсіянізму і інш.).

Літаратурная перыёдыка. Роля часопіса "Српски књижевни гласник". Богдан Попавіч і Ёван Скерліч — найбольш уплывовыя эстэтыкі, літаратуразнаўцы і крытыкі новай фармацыі.

Суадноснасць еўрапейскага і нацыянальна-традыцыйнага ў арыентацыях сербскай культуры гэтага часу: творчасць Алексы Шанціча, Светазара Чоравіча, Ранкі Младэнавіча.

Паэтычны свет Ёвана Дучыча.

Філасофскія і мастацкія вартасці вершаў Мілана Ракіча.

Творчасць Ё.Дучыча і М. Ракіча як новая школа паэтыкі і стылістыкі вершаскладання.

Асноўныя матывы паэзіі Сімы Пандуравіча, Уладзіслава Петкавіча Дзіса, Мілуціна Боіча.

Сербская літаратура міжваеннага перыяду.

Паэты з арыентацыяй на экспрэсіянізм (Мілаш Црнянскі, Станіслаў Вінавер, Тодар Манойлавіч, Душан Васілеў, Растка Петравіч, Любамір Міціч). Уласна сербскія мадэрнісцкія напрамкі: суматраизам, хипнизам, зенитизам.

Спасціжэнне таямнічага ў асобе і этнасе — творчасць Момчылы Настасіевіча.

Сербскія неарамантыкі Дэсімір Благоевіч, Радэ Драінац, Рыста Раткавіч.

Панарама сербскай прозы ў асобах Івы Чыпіка, Петара Кочыча, Велькі Петравіча, Мілуціна Ускокавіча.

Мастацкія асаблівасці твораў Борысава Станкавіча.

Гумарыстычны летапіс эпохі ў прозе Браніслава Нушыча ("Аўтабіяграфія", "Абшчыннае дзіця").

У рэчышчы сюррэалізму (серб. надреализам): Марка Рысціч, Душан Маціч, Аляксандр Вуча, Мілан Дзедзінац, Оскар Давічо.

Прадстаўнікі руху, які склалі "књижевна левица","социјална литература", "нови реализам" – Ота Біхалі Мерын, Паўле Біхалі, Весялін Маслеша, Отакар Кершавані, Радаван Зогавіч, Ёван Попавіч, Стэван Галагажа, Мірка Баневіч.

<u>Кантэкст:</u> ідэйна-эстэтычныя арыенціры харвацкіх і славенскіх пісьменнікаў (Міраслава Крлежы, Аўгуста Цэсарца, Тоне Селішкара, Міле Клопчыча, Мішка Краньца, Прэжыхава Воранца).

Літаратурная "левіца" Югаславіі ў адносінах да СССР і савецкага мастацтва: кнігі "Паездка ў Расію" М.Крлежы, "Падарожжа па Савецкаму Саюзу" А.Цэсарца, удзел О. Біхалі-Мерына ў I з'ездзе савецкіх пісьменнікаў.

Тэарэтычнае і літаратурна-крытычнае абгрунтаванне адпаведнай плыні Міланам Багданавічам, Веліборам Глігарычам, Джорджам Ёванавічам.

***8. Сербская літаратура другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя.***

Пісьменнікі левай арыентацыі ў народна-вызваленчай барацьбе (“књижевност НОБ”). Спалучэнне антыфашызму з ідэямі сацыялістычнай рэвалюцыі,“брацтва, адзінства” народаў Югаславіі — светапоглядныя пазіцыі Бранкі Чопіча, Чэдаміра Міндэравіча, Евана Попавіча, Уладзіміра Дэдзіера, Івана Горана Ковачыча, Марына Франічавіча Плочара, Скендара Куленавіча, Хасана Кікіча, Косты Рацiна, Слаўкі Янеўскага, Карала Дзястоўніка Каюха, Матэя Бора, Франца Касмача.

Разнавектарнасць літаратуры перыяду Другой сусветнай (адначасова грамадзянскай) вайны.

Спецыфіка ідэйна-эстэтычных працэсаў у Сербіі, падобна як і ўсёй Югаславіі, першага пасляваеннага дзесяцігоддзя.

Асэнсаванне гераізму і трагізму народа ў прозе 50-70-х гадоў: навелістыка “Раса на штыках”, “Суровая школа” Бранкі Чопіча, “Вялікія дзеці”, “Папараць і агонь” Антонія Ісакавіча; раманы “Вяселле”, “Кепская вясна”, “Разрыў”, “Лялейская гара”, “Аблава” Міхайлы Лаліча, “Далёка сонца”, “Падзелы”,“Казка” Добрыцы Чосіча, “Песня” Оскара Давіча, “Прарыў”, “Глухі порах” Бранкі Чопіча, “Казара” Младана Олячы.

Універсалізм мастацкага светапогляду Івы Андрыча: раманы

“Мост на Дрыне”, “Траўніцкая хроніка”, Пракляты двор”.

“Перасяленні” М.Црнянскага як значнейшы твор сербскай гістарычнай прозы.

Аналіз повязі часоў у эпічных творах Добрыцы Чосіча – “Карані”, “Час смерці”, “Час ліха”, “Час улады”.

Меша Селімавіч як выразнік рэгіянальнага, нацыянальнага і агульначалавечага.

Новыя жанры і формы сербскай прозы: “Чырвоны певень ляціць да неба”, “Герой на асле”, “Людзі з чатырма пальцамі” Міадрага Булатавіча; “Калі цвілі гарбузы”, “Петрыін вянок”, “Голы востраў” Драгаслава Міхаілавіча,“Хазарскі слоўнік” Міларада Павіча.

***

Шляхі развіцця сербскай паэзіі другой паловы XX стагоддзя.

Наватарская традыцыйнасць Дэсанкі Максімавіч.

Адметнасць творчых лёсаў і асоб: Васка Попа, Міадраг Паўлавіч,

Бранка Мількавіч, Стэван Раічкавіч, Любамір Сімавіч, Мацiя Бечкавіч, Дара Секуліч, Міларад Джурыч, Алек Вукадзінавіч, Адам Пуслаіч, Радамір Андрыч, Любіца Мілеціч, Райка Петраў Нога.

Драматургія Джорджа Лебавіча, Аляксандра Абрэнавіча, Аляксандра Попавіча, Борыслава Пекіча. Сучасны камедыёграф Душан Кавачавіч.

Літаратура для дзяцей і моладзі (Міра Алечкавіч, Гроздана Олуіч, Драган Лукіч, Браніслаў Црнчавіч, Любівое Ршумавіч, Слобадан Вуканавіч).

Сцвярджэнне спецыфічнага жанру — сатырычны афарызм (Браніслаў Црнчавіч, Паўле Кавачавіч, Душан Радавіч).

Сучасная літаратурная крытыка: Зоран Мішыч, Міраслаў Эгерыч, Петар Джаджыч, Драган Ерэміч, Мілаш Бандзіч, Паўле Зорыч, Свэта Лукіч, Зоран Глушчавіч, Срба Ігнятавіч.

Кантэкст: Ранка Марынкавіч, Векаслаў Калеб, Іван Дончавіч, Мірка Божыч, Уладан Дэсніца, Марыян Маткавіч, Весна Парун, Антун Барац (Харватыя), Цырыл Касмач, Матэй Бор, Іван Потрч, Тоне Паўчак, Драга Янчар, Ёсіп Відмар(Славенія), Блажа Канескі, Слаўка Янеўскі, Міхаіл Рэнджаў (Македонія).

# *IV. ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА*

## *Спіс літаратуры*

### *Агульныя пытанні культуры, этналогіі, гісторыі*


Аншаков Ю.П. Становление Черногорского государства и Россия (1798 – 1856 гг.). – М., 1998.

Арсеньев А. У излучины Дуная. Очерк жизни и деятельности русских в Новом Саду. – М., 1999.

Бажова А.П. Россия и югославяне в конце XVIII – начале XIX века. – М., 1996.

Бантыш-Каменский Д.Н. Путешествие в Молдавию, Валахию и Сербию. – М., 1810

Барокко в славянских культурах. – М., 1982.

Бобрински В, гроф. Са пута по Југославији. – Београд, 1919.

Босния, Герцеговина и Старая Сербия. Сборник, составленный А.Гильфердингом. – СПб., 1859.

Воронин Т.Л. Родная Сербия (История братского народа). – М., 2004.

Геземан Г. Чојство и јунаштво старих Црногораца. – Цетиње, 1968.

Гудков В. Славистика. Сербистика: Сб. статей. – М., 1999.

Данченко С.И. Развитие сербской государственности и Россия 1878-1903. – М., 1996.

Дворниковић В. Карактерологија Југословена. – Београд: Геца Кон, 1939 [Репринт - Београд: Просвета, 1990].

Дебељковић С. Водич кроз манастире, цркве и споменици културе Србије. – Београд, 1994.

Державин Н.С. Болгарско-сербские взаимоотношения и македонский вопрос. – СПб., 1914.

Довгяло М.С. Политическая история зарубежных славянских стран новейшего времени: справочник. – Минск, 2006.

Драгић Кијук Предраг Р. Уметност и зло. – Београд, 2005.

Драгић Кијук Предраг Р. Беседе о Европи. – Београд, 2007.

Дробњаковић Б. Етнологија народа Југославије. Књ. I. – Београд, 1960.

Ђорђевић Тихомир. Наш народни живот. – Београд,1984.

Ђорђић П. Историја српске ћирилице. 2. Издање. – Београд, 1986.

Екмечић Милорад. Србија између Средње Европе и Европе. – Београд: Политика: БМГ, 1992.

Деретић Јован. Културна историја Срба. Предавања. – Београд; Крагујевац, 2001.

Джуретич Веселин. Развал Югославии. – М., 2003.

Джурич М.М. Образование многонационального государства Югославии (1918-1921). – М., 1970.

Ердељановић Ј. Стара Црна Гора. – Београд, 1978.

Зечевић С. Митска бића српских предања. – Београд: Вук Караџић, 1981.

Зечевић С. Српске народне игре. – Београд: Вук Караџић, 1983.

Историја српског народа. I-II. – Београд, 1981.

История культур славянских народов. В 3 т. - Т 1: Древность и Средневековье / Отв. ред. Г.П. Мельников. – М., 2003; Т.2: От барокко к модерну/ Отв. ред. Г.П. Мельников. – М., 2005; Т.3: Культура XX века: от модернизма до постмодернизма. Народная культура славянского региона. Отв. ред. Г.П. Мельников. – М., 2008.
История Югославии: В 2-х т. / Под ред. Л.Б.Валева и др. Библиогр., сост. Л.П.Лихачева. – М., 1963.
История южных и западных славян. – М., 1969.
Јовановић Бојан. Карактерологија Срба. – Београд, 1992.
Јиричек К. Историја Срба. I-II. – Београд, 1952, 1978, 1980.
Карасек О. История славянских литератур. – СПб., 1910.
Ковалевский Е.П. Черногория и славянские земли. – СПб., 1872.
Ковачевић Душко М. Србија и Русија: 1878-1889: Од Берлинског конгреса до абдикције краља Милана. – Београд, 2003.
Косик В.И. Русская Церковь в Югославии (20-е - 40-е гг. XX в.) – М., 2000.
Костяшов Ю.В. Сербы в Австрийской монархии в XVIII в. – Калининград, 1992.
Крижанич Юрий. Политика / Пер. и коммент. А.Л.Гольберга. – М., 1997.
Крстић Небојша М. Политика и образ. За васкрс распетог србства. Друго, непромењено издање. – Београд, 1994.
Кудрявцева Е.П. Россия и образование автономного Сербского государства (1812- 1833 гг.) / Отв. ред. А.Л.Нарочицкий, А.В.Игнатьев. – М., 1992.
Кулаковский П.А. Начало русской школы у сербов в XVIII веке. Очерк из истории русскаго влияния на югославянския литературы. – СПб., 1903.
Кулишић Ш., Петровић П. Ж., Пантелић Н. Српски митолошки речник. – Београд, 1998.
Ламанский В. О некоторых славянских рукописях в Белграде, Загребе и Вене. – СПб., 1864.
Лещиловская И.И. Сербская культура XVIII века. – М., 1994.
Лещиловская И.И. Сербский народ и Россия в XVIII веке. – СПб., 2006.
Маевский В.А. Путевые наброски (Турция, Сербия, Черногория и Далмация). – СПб., 1913.
Маевский В.А. Великая Россия и героическая Сербия. – М., 1914.
Маевский В.А. Будущая Югославия. – Киев, 1918.
Маевский В.А. Сербский патриарх Варнава и его время. – Белград, 1931.
Маевский В.А. Взаимоотношения России и Сербии. Т. 1-2. – Нью-Йорк, 1960-1966.
Маевский В. Русские в Югославии: 1920-1945 гг. – Нью-Йорк, 1966.
Максимовић Владимир. Темельна српска библиографија: Књиге од 1868 до данас. Друго издање. – Београд, 2010.
Маркавіч Мірка. Версальская Югаславія. – Менск, 1933.
Марковић Марко С. Пола века српске Голготе (1941 - 1991). – Београд, 1995.
Маркович Светозар. Избранные сочинения / Общая ред. С.А.Никитина. Вступит. статья и коммент. В.Г.Карасева. – М., 1956.
Медаковић В.М. Живот и обичаи Црногораца. – Нови Сад, 1860.
Мещерский В.П. Правда о Сербии. Письма. – СПб., 1877.

Милеуснић С. Свети Срби. – Нови Сад, 2000.
Милосављевић Мила. Српски великани. – Београд, 2010.
Милошевић Зоран. Одбрана између сна и јаве. – Београд, 1992.
Милошевић Зоран. Осам православних медаљона – Путописи и репортаже из Републике Српске. – Београд, 2001.
Милошевић Зоран. Црква и политика. – Београд, 2003.
Милошевић Зоран. Транзиција и Српска Црква. – Београд, 2004.
Милошевић Зоран. Бошњачко поништавање Срба. – Српско Сарајево, 2004.
Митровић Ј. Д. Народносна свест у Срба. – Београд, 1989.
Михаљчић Раде. Крај Српског Царства. – Београд, 1975.
Михаљчић Раде. Јунаци Косовске легенде. 3 доп. изд. – Парачин, 1993.
Народ сербскі: яго абрады і звычаі, святы і святыні / Укладанне, каментарыі і агульная рэдакцыя І. Чароты. Зб. 1-2. – Мн., 2006-2012.
Недељковић Драгољуб. Дом без крова. Размишљања о великој драми Југославије. – Нови Сад, 1990.
Недељковић М. Годишњи обичаји у Срба. – Београд, 1990.
Никифоров Н.В. Сербия в середине XIX в. Начало деятельности по объединению сербских земель. – М., 1995.
Нодило Н. Стара вјера Срба и Хрвата. – Сплит, 1981.
Очерки истории культуры славян / Отв. ред. О.В. Белова. – М., 1996.
Павлюченко О.В. Россия и Сербия, 1888 -1903: Дипломат. отношения, обществ. связі Киев, 1987.
Петров Н.И. Исторический взгляд на взаимные отношения между сербами и русскимі Киев, 1876.
Писарев Ю.А.. Тайны первой мировой войны. Россия и Сербия в 1914-1915 гг. – М., 1990.
Писарев Ю.А. Сербия на Голгофе и политика Великих держав 1916 г. – М., 1993.
Погодин А.Л. История Сербии. – СПб.: Изд."Брокгауз-Ефрон", 1909.
Погодин А.Л. Славянский мир. Политическое и экономическое положение славянских народов перед войной 1914 г. – М., 1915.
Политические и культурные отношения России с югославянскими землями в XVIII в. Документы. – М., 1984.
